*А.С. Волчек*
*БДЭУ(Мінск)*

# АСАБЛІВАСЦІ АРГАНІЗАЦЫІ ДЫПЛАМАТЫЧНАЙ СЛУЖБЫ ВКЛ У КАНЦЫ XIV — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVI ст.

Вялікае княства Літоўскае (ВКЛ) з'яўлялася адной из найбуйнейшых краін сярэднявечнай Еўропы і з моманту свайго ўзнікнення праводзіла самастойную знешнюю палітыку. Дыпламатычная служба ВКЛ мела сваіх супрацоўнікаў, пэўны этыкет і сваю дакументацыю. Нормы дыпламатычнай практыкі беларуска-літоўскай дзяржавы насілі агульнаеўрапейскі характар. У сярэдневякоўі манарх з'яўляўся адзіным суб'ектам суверэннасці дзяржавы і толькі ён меў права прадстаўляць яе на міжнароднай арэне. Усе дыпламатычныя кантакты ВКЛ ажыццяўляліся ад імя Вялікага князя і з яго дазволу. Міжнародныя дагаворы набывалі юрыдычную сілу толькі пасля замацавання іх асабістай прысягай і пячаткай уладара. Але любое рашэнне, якое тычылася дыпламатычных зносін з замежнымі дзяржавамі ў канцы XIV — першай трэці XVI ст., прымалася звычайна Вялікім князем сумесна з яго дарадчыкамі.

Важнае значэнне ў дыпламатычных зносінах паміж дзяржавамі і ў дыпламатычных дакументах мела дакладнае выкарыстанне тытулаў іх уладароў. Пасля хрышчэння па каталіцкаму абраду літоўцаў-язычнікаў у 1387 г. і заснавання Ягайлам у гэтым жа годзе Віленскага біскупства ВКЛ далучылася да супольнасці хрысціянскіх дзяржаў, а Вялікі князь літоўскі заняў пачэснае месца сярод еўрапейскіх манархаў. Правіцелі еўрапейскіх дзяржаў падчас дыпламатычных зносін ужывалі звароты, якія былі запазычаны з практыкі сваяцкіх адносін і азначалі сімвалічную роднасць. Так, напрыклад, Вялікі князь Вітаўт падтрымліваў цесныя кантакты з імператарам Свяшчэннай Рымскай імперыі Сігізмундам I. Пасля 1411 г. абодва манархі, звяртаючыся адзін да аднаго, звычайна выкарыстоўвалі слова «consangvineus» («крэўны»). Каля 1420 г. у двухбаковых адносінах пачаў ужывацца тэрмін «frater» («брат»). У канцы XV ст. канчаткова замацаваўся ўзаемны зварот «frater et consangvineus» («брат крэўны»), што на дыпламатычнай мове сцвярджала фармальную роўнасць манархаў. У лістах да Папы Рымскага Вітаўт называў сябе яго сынам. Кроўнароднасныя звароты выкарыстоўваліся і ў адносінах з малдаўскімі гаспадарамі. Вялікага князя літоўскага Жыгімонта Кейстутавіча ў дагаворы 1437 г. малдаўскі ваявода Ілля называе «родителем».

Асноўным відам дзейнасці дыпламатычнай службы ВКЛ былі іх перагаворы. У залежнасці ад спосабу іх правядзення можна вылучыць тры віды: абмен пасольствамі; абмен дыпламатычнымі лістамі і грама-



Электронная библиотека БГЭУ

тамі; непасрэдныя перагаворы манархаў. Перагаворы маглі быць двух-баковымі і шматбаковымі; дыпламатычнымі, якія ажыццяўляліся ўпаўнаважанымі пасламі, і палітычнымі, якія вяліся на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў.

У гэты час у Еўропе існавала так званая аказіянальная дыпламатыя. У ВКЛ, як і у большасці тагачасных еўрапейскіх краін, акрамя дзяржаў Апенінскага паўвострава, не было пастаянных паслоў-рэзідэнтаў. Пасольствы насілі часовы характар і ствараліся для вырашэння канкрэтных задач («по случаю»). Пасольствы ў іншыя дзяржавы арганізоўваліся наступным чынам. Вялікі князь вызначаў кандыдатуру пасла ці ганца, колькасны склад пасольства і паведамляў пра гэта радзе, якая ў абсалютнай большасці выпадкаў згаджалася з яго рашэннем. Метады і сродкі дзейнасці дыпламатыі ВКЛ залежалі ад канкрэтнага міжнароднага становішча і дыпламатычнага партнера, ад узроўню падрыхтоўкі дыпламатаў. Дыпламаты ВКЛ у перагаворах апеліравалі да хрысціянскай салідарнасці, міжнародных дамоў і пагадненняў, гістарычных традыцый і маральных каштоўнасцяў.

Такім чынам, у канцы XIV — першай трэці XVI ст. Вялікі князь з'яўляецца фактычным кіраўніком дыпламатычнай службы дзяржавы. Аднак важныя знешнепалітычныя рашэнні манарх прымаў толькі пасля кансультацый са сваім найбліжэйшым акружэннем. Развіццё дыпламатычнай службы ВКЛ адпавядала гістарычнай эпосе і ўзроўню развіцця краіны.

*К.М. Воронова*
*БГЭУ (Минск)*

## ПРИНЦИП ЭКОЛОГИЧЕСКОЙ ОТВЕТСТВЕННОСТИ БИЗНЕСА

Термин «социальная ответственность бизнеса» в настоящее время широко используется для характеристики тенденций экономического развития. Однако данное понятие является комплексным и включает в себя «экологическую ответственность» как один из составных элементов.

Экологическая ответственность бизнеса — добровольная разработка системы мер и мероприятий, выходящих за рамки законодательства в сфере охраны окружающей среды, и их реальное осуществление.

Безусловно, состояние белорусского бизнеса и общества в целом не позволяют в полном объеме копировать идеи, принятые в развитых странах. Так, например, давно и успешно продвигается принцип экологической ответственности бизнеса в Западной Европе, где существует целая экологическая промышленность, основные доходы которой приносят создатели экологически чистых технологий производства.



Электронная библиотека БГЭУ
БДЭУ Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
BSEU Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by